Заканчэнне юбілейнага года: прымірыць міласэрнасць са справядлівасцю

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
20.11.2016 00:00



Ва ўрачыстасць Хрыста, Валадара Сусвету, папа Францішак урачыста закрыў галоўныя Брамы міласэрнасці ў рымскай базіліцы св. Пятра. Тым самым у Касцёле быў афіцыйна завершаны Юбілейны год міласэрнасці. Але гэта зусім не азначае, што час ласкі закончыўся. Насупраць, Надзвычайны год стаў для вернікаў нібы ўзлётнай паласой. Юбілей дапамог паглыбіцца ў таямніцу Божай міласэрнасці, адчуць сябе ў абдымках любячага Айца і па Яго прыкладзе навучыцца самаахвярнасці для бліжняга. “Таму духоўна адноўленыя і ўзмоцненыя прагнем вярнуцца да штодзённасці, памятаючы, што нашая пастава адносна бліжніх, асабліва тых, хто найбольш патрабуе дапамогі, з’яўляецца лепшай праверкай глыбіні веры і сапраўднасці нашай любові да Бога”, – заўважыў у гаміліі на заканчэнне Года міласэрнасці біскуп Гродзенскі Аляксандр Кашкевіч. Падчас Года міласэрнасці ў гродзенскім Касцёле адбылося шмат знамянальных падзей. Якраз у гэты час дыяцэзія адзначыла юбілей ад свайго заснавання і прызначэння першага ардынарыя – ксяндза біскупа Аляксандра Кашкевіча. Галоўныя ўрачыстасці прайшлі ў Гродне падчас Нацыянальнага эўхарыстычнага кангрэсу. Важнай падзеяй для дыяцэзіі стала таксама інсталяцыя Гродзенскага катэдральнага капітула Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі і святога Казіміра. Гэта сведчыць аб тым, што структуры мясцовага Касцёла развіваюцца, а разам з імі, і душпастырскае жыццё верных. †

Заканчэнне юбілейнага года: прымірыць міласэрнасць са справядлівасцю

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
20.11.2016 00:00









Заканчэнне юбілейнага года: прымірыць міласэрнасць са справядлівасцю

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
20.11.2016 00:00





